Шмігельская А.Э., Воюш І.Д. (Мінск)

Перадача структуры арыгінала ў перакладах Максіма Багдановіча з французскай мовы

Перакладчыцкая дзейнасць змушае літаратара да тонкай даследчыцкай працы, пранікнення ў глыбокія іншамоўныя пласты, адчування семантычных нюансаў, шырокай эрудыцыі. Звернемся да вопыту М. Багдановіча – мастака-перакладчыка, які адным з першых увёў у кантэкст айчыннага прыгожага пісьменства заходнееўрапейскую паэзію, а таксама стаяў ля вытокаў літаратурнага перакладу на беларускую мову.

Асноўнае месца ў перакладчыцкай спадчыне М. Багдановіча займае французская паэзія, якая прадстаўлена 22 творамі Поля Верлена і адным санетам Алексіса-Фелікса Арвера. Беларускі паэт ставіў уласныя пераклады з Верлена даволі высока, аб чым сведчыць яго ліст ад 29 ліпеня 1912 г. ў рэдакцыю «Нашай нівы»: «Надумаўся я памясціць у зборнічак і пераклады з Верлена, каторыя раней надаслаў у Піцер. Пераклады да арыгінала блізкія, і, калі я магу іх справядліва ацаніць, – добрыя… Ва ўсякім разе пераклады Верлена больш вартыя друку, чым гэтыя трафараты, да ліку каторых трэба прыпісаць і верш «Шмат у нашым жыцці ёсць дагог…» [Цыт. па: 1, с. 549].

Светлае, цёплае ўражанне застаецца ад перакладаў М. Багдановіча з Верлена. Невыпадкова гэтыя пераклады нагадваюць уласныя вершы паэта. Пры знешняй адрознасці матываў агульнымі застаюцца вытанчанасць, філасофская глыбіня, музычнасць, суладдзе ўнутраных перажыванняў лірычных герояў са станам наваколля, перадача ў мелодыцы тэксту біцця сэрца ўсяго сусвету.

Праілюструем гэту думку вершам Верлена са зборніка «Poèmes saturniens» («Сатурнічныя паэмы»), выдадзенага ў 1866 г., раздзел «Paysages tristes» («Сумныя пейзажы»).

Арыгінал:	*Падрадковы пераклад:*	*Пераклад Багдановіча:*
Chanson d'automne	**Песня восені**	**Chanson d'automne**
Les sanglots longs	Плач доўгі	Як раньш, пяе
Des violons	Скрыпак	І ў сэрца б'е
De l'automne	Восені.	Сумны тон.
Blessent mon cœur	Раніць маё сэрца	То, восень, іх,
D'une langueur	Зняможанасцю	Бальных тваіх
Monotone.	Манатоннай.	Скрыпак, стогн.
Tout suffocant	Увесь задушлівы	Чу! Часу ўдар!
Et blême, quand	І мярцвяна-бледны, калі	Бляднее твар,
Sonne l'heure,	Звоніць час:	Рвецца ўздых:
Je me souviens	Я ўспамінаю	Ўстаў карагод
Des jours anciens	Дні былыя,	Мінулых год,
Et je pleure,	І я плачу.	Дзён былых.
Et je m'en vais	І я жыву	А віхр ліхі,
Au vent mauvais	На ветры злым,	Што ў лісць сухі,
Qui m'emporte	Што нясе	Дзьме ў мяне.
Deçà delà	Туды-сюды	Нясе туды,
Pareil à la	Лісце мёртвае.	Нясе сюды,
Feuille morte [3].		Ў даль імкне [1, с. 173].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адораны выключным эстэтычным слыхам, М. Багдановіч захоўвае рытміку верленаўскага верша, яго гучанне, настрой, закладзеныя не толькі і не столькі ў сэнсе ўжытых слоў, колькі ў мелодыцы, якая ствараюе атмасферу восеньскай тугі і меланхоліі. Ламаны рытм робіць тэкст асабліва пранікнёным, у нечым падобным на мерныя ўдары абуджаных ветрам званоў. Г. Сініла ў даследаванні «Максім Багдановіч як перакладчык заходнееўрапейскай паэзіі» падкрэслівае абыходлівае стаўленне інтэрпрэтатара да аўтарскага слова: «Паэт імкнецца захаваць вельмі важныя для Верлена enjambements – пераносы, разрывы на межах радкоў (“Des violins / De l’automne” – “тваіх / Скрыпак…”), але ў імя агульнага настрою прыйшлося ахвяраваць такім важкім фінальным пераносам, што вылучае ў апошні радок і ставіць пад асобны націск словы “мёртвы лісток”» [2, с. 9].

Што тычыцца зместу, то М. Багдановіч не баіцца зрэдку змяняць яго, падбіраючы на ўласны густ словы і вобразы, аднак, заўжды пакідаючы некранутым сутнасны каркас, агульны імператыў твора. Паэт інтуітыўна адчувае «душу» верша – падтэкст, таму смела пераўвасабляе яго. Перакладчык не імкнецца да дакладнасці радка, да блізкага тэкстуальнага супадзення, як да самамэты – ён хоча перадаць гукавы арнамент, настрой арыгінала і, вядома, яго паэтычную тэму. М. Багдановіч бярэ адно-два апорныя, так званыя «якарныя», словы і на гэтым выбудоўвае свой пераклад.

Звернемся да варыянта першых шасці радкоў чарнавога аўтографа, які, паводле каментарыяў у Зборы твораў, захоўваўся у архіве паэта: «Працяжны зык / Выводзіць смык / Хмурых дзён, / Як больна тне / У сэрца мне / Плачам ён!» [1, с. 617]. Відавочна, што Максім Кніжнік падыходзіў да працы над перакладамі вельмі сур’ёзна, неаднаразова змяняючы і перарабляючы, удасканальваючы тэкст, імкнучыся як мага больш дакладна і акрэслена перадаць яго ўнутраны сэнс, каб беларускі чытач змог у поўнай меры адчуць дух, палёт, аўтэнтыку французскай страфы.

На матэрыяле перакладу з Верлена «Раяль цалуе тонкая рука…» можна назіраць дзівосную здольнасць паэта дакладна і выразна перадаваць гучанне арыгінала, толькі злёгку закранаючы першапачатковы сэнс, уносіць у верш ўласныя аўтарскія адценні, робячы тканіну твора больш зразумелай, ментальна блізкай беларускаму чытачу.

Арыгінал:	*Падрадковы пераклад:*
Le piano que baise une main frêle	**Піяніна, якое цалуе тонкая рука**
Le piano que baise une main frêle	Піяніна, якое цалуе тонкая рука.
Luit dans le soir rose et gris vaguement,	Свеціць ружовы і шэры вечар смутна,
Tandis qu'un très léger bruit d'aile	У той час як вельмі лёгкім шумам крыла
Un air bien vieux, bien faible et bien charmant	Вельмі стары, вельмі слабы і вельмі цудоўны пах
Rôde discret, épeuré quasiment,	Блукае, стрыманы,
Par le boudoir longtemps parfumé d'Elle.	Па будуары пах яе.
Qu'est-ce que c'est que ce berceau soudain	Што гэта за нечаканая калыска,
Qui lentement dorlote mon pauvre être?	Што так павольна лашчыць маё беднае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	цела?
Que voudrais-tu de moi, doux Chant badin?	Што ты жадаў бы ад мяне, прыемны жартаўлівы Спеў?
Qu'as-tu voulu, fin refrain incertain	Што ты жадаў, тонкі нявызначаны прыпеў,
Qui vas tantôt mourir vers la fenêtre Ouverte un peu sur le petit jardin? [3].	Які хутка абарвецца ля акна, Прачыненага ў маленькі сад?

Пераклад Багдановіча:

Раяль цалуе тонкая рука

Раяль цалуе тонкая рука
У час вячэрні, шэра-ружаваты;
І на крылах, цішэй ад вецярка,
Ў паветры мяккім, пекным паплыла ты
Пужліва, песня, і срэдзь комнат хаты
Шчэ доўга веяў пах, як ад цвятка.

Што за калыска ціха так гайдае
Стамлёнага, бяздольнага мяне?
Чаго, як жэўжык, песня вымагае?
І што ў канцы яе прыпеў жадае,
Каторы гэтак хутка у акне,
Адчыненым на садзік, замірае? [1, с. 178].

Надзвычай дакладна каменцыруе змены, унесеныя ў тэкст верша М. Багдановічам, згаданая намі даследчыца: «Невялічкія лексічныя зрухі («срэдзь комнат хаты» замест «par le boudoir» – «у будуары»; «пах, як ад цвятка» замест «parfumé d'Elle» – «водар ад яе (песні)»; «жэўжык» замест «doux Chant badin» – «пяшчотная, жартаўлівая песня») ствараюць настрой простасці, утульнасці, дамашнасці. Перад намі ўжо не вытанчаны пакой альбо будуар, у якім плывуць, як водар дарагіх духоў, гукі раяля, а просценькі пакойчык хаты, дзе гучанне музыкі зліваецца з пахам кветак, што даносіцца з прыадчыненага на маленькі садзік акончца» [2, с. 9].

Паэт, выказляняючы дэталі, тым не менш, лёгка і дакладна перадае настрой верленаўскага верша, яго мяккую, тонкую, ціхую атмасферу. Перад намі паўстае палатно, напісанае калісьці П. Верленам: шэра-ружовы вечаровы паўзмрок, ледзьве прыкметны ветрык, доўгія цені, лёгкі пошум лістоты за аконнымі шыбамі. Алітарацыя на шыпячыя падкрэслівае ўтульнасць і цішыню пакоя, якая парушаецца толькі пяшчотнымі гарманічнымі пералівамі раяля. У кожнай кроплі святла, што адбіваецца ў слановакосных клавішах, увасабляецца бясконцы свет. Коціцца дробным кавалкам гравію маўклівы час, ён застывае ў змрочным маўчанні, у мядовым гадзінніку ля сцяны, развявае ў сатлелым паветры пах кветак і музыкі. Горад за акном пакрысе патанае ў бязмоўі ночы.

«De la musique avant toute chose» («Музыкі перш за ўсё») – паўтараў П. Верлен, падкрэсліваючы неабходнасць перадачы агульнага пачуцця не сродкамі слова і вобраза, а менавіта праз падтэкст і мелодыку верша. Гэта меркаванне поўнасцю адпавядае мастакоўскаму характару беларускага паэта і перакладчыка. Нездарма ён узяў верленаўскія радкі за эпіграф да верша

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Маёвая песня». Чуйны да адценняў слова і думкі, М. Багдановіч востра адчуваў велічную мелодыю свету і заключаў яе ў своеасаблівую партытуру – пераклады з французскай мовы.

Літаратура

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Сініла, Г. Максім Багдановіч як перакладчык заходнееўрапейскай паэзіі / Г. Сініла // Веснік БДУ. – Сер. 4. – 1991. – № 3. – С. 3–9.
3. Verlaine, P. Liste des poèmes de l'auteur / P. Verlaine // Les grands classiques [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу : http:/poesie.webnet.fr/lesgrandsclassiques/poemes/paul_verlaine/paul. – Дата доступу : 16.10.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ